# Пракімны штодзённыя на літургіі

***У панядзелак***

Абіходны напеў, тон 4-ы




Верш: Дабраславі, душа мая, Госпада; Госпадзе, Божа мой, Ты вельмі вялікі.




*Алілуя,тон 5-ты: Усхваляйце Госпада, усе анёлы Яго, хваліце Яго, усе сілы Яго.*

*Верш: Бо Ён сказаў, і яны сталіся; Ён загадаў, і яны з’явіліся.*

***У аўторак***

Абіходны напеў, тон 7-ы




Верш: Пачуй, Божа, голас мой, калі малюся да Цябе.




Алілуя, тон 4-ты: Праведнік, нібы пальма, расквітнее, нібы кедр Ліванскі, вырасце.

Верш: Пасаджаныя ў доме Гасподнім расквітнеюць у дварах Бога нашага.

***У сераду*** Абіходны напеў, тон 3-і




Верш: Што зірнуў Ён на пакору Рабы Сваёй; бо вось ад гэтага часу будуць зваць Мяне шчаслівай усе роды.




Алілуя, тон 8-мы: Слухай, Дачка, і глядзі, і прыхілі вуха Сваё.
Верш: Абліччу Твайму паклоняцца багатыя з народу.

***У чацвер*** Абіходны напеў, тон 8-ы




Верш: Нябёсы распавядаюць пра славу Божую, створанае ж рукою Яго абвяшчае цвердыня.




Алілуя, тон 1-шы: Праслаўяць нябёсы цуды Твае, Госпадзе, і ісціну Тваю ў Царкве святых.
Верш: Бог праслаўляецца ў сходзе святых.

***У пятніцу***

Абіходны напеў, тон 7-ы




Верш: Госпад царуе, няхай злуюцца народы.




Алілуя, тон 1-шы: Успомні сход Твой, які набыў Ты адвеку.

Верш: Бог - Цар наш адвеку, ён здзейсніў забаўленне пасярод зямлі.

***У суботу***




Верш: Шчаслівыя тыя, чые беззаконні выбачаны і чые грахі прабачаны.

Алілуя, тон 4-ты: Усклікнулі праведныя і Госпад пачуў іх і ад усіх бед іх збавіў іх.

Верш: Многа бед у праведных і ад усіх іх ўратуе Ён іх.